# КОМПЛЕКСНАЯ РАБОТА ПА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ І ЛІТАРАТУРЫ

*Ліда, 2021 г.*

## *ДАВЕДКА ДЛЯ ЖУРЫ*

**9 клас**
**Варыянт 2**

**Заданне 1.**
**А**

| Колькасць літар і гукаў супадае | Літар больш, чым гукаў | Гукаў больш, чым літар |
|---|---|---|
| *адстаяць* | *прыходзіць* | *ліквідуе* |
| *па-свойму* | *сутыкненні* | *наяўныя* |
| *спрабуюць* | | |

**Б**
*Аўтасродкаў, ацэньвае, навукова абгрунтаваных, розначытанняў, эфектыўна*

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 2.** А3Б4В1Г6Д2Е5

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 3.**

| | |
|---|---|
| А | змяіцца |
| Б | ахнуў |
| В | пляск |
| Г | адразу |
| Д | схілах |
| Е | запас |

*За кожны правільны адказ – 1 бал.*

**Заданне 4.**

| | Займеннік (форма ў сказе) | Пачатковая форма | Разрад | Сінтаксічная функцыя |
|---|---|---|---|---|
| 1. | чагосьці | **штосьці** | **няпэўны** | **дапаўненне** |
| 2. | **усё** | **увесь** | азначальны | **дзейнік** |
| 3. | **(аб) сім-тым** | **сёй-той** | няпэўны | **дапаўненне** |
| 4. | нічым | **нішто** | **адмоўны** | **дапаўненне** |

*За кожную правільна запоўненую клетку – 0,5 бала.*

**Заданне 5.**

| Умова | Магчымыя ўзоры адказаў |
|---|---|
| Складаназалежны сказ з даданай азначальнай | Я незвычайна ўдзячны сябру, які дапамог мне годна выйсці з сітуацыі. |
| Складаназалежны сказ з даданай месца | Да ўказанай галоўнай часткі нельга далучыць дададзеную акалічнасную месца, таму што ў галоўнай частцы няма ўказальных слоў, з якімі звычайна звязваюцца такога тыпу даданыя часткі. |
| Складаназалежны сказ з даданай прычыны | Я незвычайна ўдзячны сябру, таму што ён дапамог мне годна выйсці з сітуацыі. |
| Складаназалежны сказ з даданай уступкі | Я незвычайна ўдзячны сябру, хоць яго дапамога і паказала маю слабасць. |
| Складаназалежны сказ з даданай выніку | Я незвычайна ўдзячны сябру, так што буду памятаць пра яго дапамогу ўсё жыццё. |
| Складаназалежны сказ з даданай параўнальнай | Я незвычайна ўдзячны сябру, як удзячна небу кожная расліна на зямлі. |

*За кожны правільна падабраную частку сказа або тлумачэнне немагчымасці яе ўтварэння – 1 бал.*

**Заданне 6.**

| | **Выпраўлены варыянт** | **Тлумачэнне** |
|---|---|---|
| А | па карэнні (па каранях) | Зборныя назоўнікі не змяняюцца па ліках. |
| Б | | Памылкі няма. |
| В | даўжэйшыя за | У простай форме вышэйшай ступені параўнання прыметніка павінен быць суфікс -*эйш*- (-*эй*- – гэта суфікс прыслоўя). |
| Г | прыпаў ілбом | Нарматыўная форма роднага склону назоўніка *лоб – ілбом* (*лбом* – пасля галосных). |
| Д | тры вялізныя хвоі | Пры лічэбніках *два, тры, чатыры* назоўнікі і дапасаваныя да назоўнікаў прыметнікі маюць форму множнага ліку назоўнага склону. |
| Е | Мне баліць галава | Пры дзеяслове *баліць* патрабуецца назоўнік (займеннік) давальнага склону без прыназоўніка. |

*За кожны правільна запоўнены радок – 1 бал (па 0,5 бала за выпраўлены варыянт і за тлумачэнне). У пазіцыі 2 удзельнік алімпіяды, які адзначыў у слупку “Тлумачэнне”, што “памылкі няма”, атрымлівае 1 бал.*

**Заданне 7.**

У чым задача дэтэктыва – даць адпачынак напружанаму сучасным рытмам жыцця інтэлекту чытача ці, наадварот, прымусіць мозг папрацаваць у пошуках рашэння дэтэктыўнай загадкі? У таленавітых дэтэктыўных гісторыях чытачу даецца (прадастаўляецца) магчымасць самастойна рашыць гэтае ўраўненне пры дапамозе гатовых фактаў, што патрабуе пэўнай разумовай працы (работы розуму). Такім чынам, чытанне дэтэктыва нагадвае рашэнне (падобнае да рашэння) хітрых арыфметычных задач.

*За кожную памылку (любога тыпу) ад максімальнай колькасці балаў адымаецца 0,1 бала, але павінна атрымацца не менш за 0 (нуль) балаў.*

**Заданне 8.**

| Эпас | Лірыка | Драма | Універсальныя | Не адносяцца ні да адной з папярэдніх калонак |
|---|---|---|---|---|
| нарыс | трыялет | фарс | іронія | байка |
| апавяданне | актава | рэмарка | апісанне | ліра-эпас |
| навела | ода | вадэвіль | дэталь | |
| жыціе | санет | камедыя | гумар | |
| | лірычны герой | | пародыя | |

*За кожны правільны адказ – 0,3 бала.*

**Заданне 9.**

| Прыклад | Персанаж | Назва твора | Аўтар |
|---|---|---|---|
| А | Дзядзька Антось | “Новая зямля” / “Дзядзька-кухар” | Якуб Колас |
| Б | Пора-Леановіч | “Паром на бурнай рацэ” / “Леаніды не вернуцца да зямлі” / “Нельга забыць” | Уладзімір Караткевіч |
| В | Пані Мар’я / М. Анджэеўская | “Сірочы хлеб” / “Урокі пані Мар’і” | Янка Брыль |
| Г | Мульцік | “Вечар” | Аляксей Дудараў |

*За кожны правільны адказ – 0,5 бала.*

**Заданне 10.**

**“Магіла льва” –** ***паэма*** класіка беларускай літаратуры ***Янкі Купалы***. Твор быў завершаны 2 ліпеня 1913 года ў Акопах, упершыню апублікаваны ў газеце ў лютым 1920 года.

У аснове сюжэта – легенда пра ўзнікненне Магілёва, пра Машэку, які нібыта пахаваны пад Машэкавай гарой. У творы расказваецца пра каханне асілка Машэкі і дзяўчыны ***Натальні***, якая здрадзіла яму з панам. У выніку Машэка стаў разбойнікам, які помсціць і звычайным людзям, і пану. У фінале забіла Машэку ***Наталька***.

Вобразы галоўных герояў глыбока рамантычныя і незвычайныя. Тут паказаны пакуты кахання і здрады.

Твор перакладзены на малдаўскую, рускую, украінскую мовы. Па яго матывах Р. Пукст напісаў оперу “Машэка”.

*За кожную правільна выпраўленую памылку – 1 бал. За нарошчванне артыкула фактам(і) з твора – 1 бал. За нарошчванне артыкула элементам(і) аналізу твора – 1 бал.*